# Бібліяграфічныя паказальнікі па медыцыне

*В. А. Касап, Р. А. Ровіна*

За апошнія пяць год (з 2001 па 2005) бібліяграфічная прадукцыя па медыцыне працягвае развівацца. За гэты перыяд было падрыхтавана больш за 20 самастойных бібліяграфічных паказальнікаў і спісаў літаратуры, акрамя таго, пэўная колькасць бібліяграфічных спісаў была размешчана ўнутры кніг і часопісаў. Трэба адзначыць рэзкае скарачэнне агульнай колькасці рыхтуемай бібліяграфічнай прадукцыі ў традыцыйным выглядзе на паперы і актыўнае папаўненне баз даных, электронных каталогаў бібліятэк. У падрыхтоўцы бібліяграфічных паказальнікаў і спісаў літаратуры ў гэты перыяд прымалі ўдзел: Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка (РНМБ), бібліятэкі ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў, музей гісторыі медыцыны, інфармацыйныя цэнтры, а таксама асобныя спецыялісты. Па-ранейшаму ў патоку пераважаюць навукова-дапаможныя бібліяграфічныя дапаможнікі, што звязана, безумоўна, з іх выкарыстаннем асноўнай катэгорыяй карыстальнікаў – навуковымі супрацоўнікамі. На жаль, у сённяшніх умовах стварэння электроннай інфармацыйнай прасторы, бібліятэкамі Беларусі не вызначана месца бібліяграфічнай прадукцыі для задавальнення прафесійных інфармацыйных запатрабаванняў спецыялістаў медыцынскага профілю. За пяць год не складзена бібліяграфічных дапаможнікаў для ўрачоў. У краіне шмат увагі надаецца папулярызацыі медыцынскіх ведаў, здароваму ладу жыцця, але ролі рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі ў гэтым працэсе надаецца недастаткова ўвагі.

Сярод створаных бібліяграфічных паказальнікаў па перыядычнасці пераважаюць рэтраспектыўныя – іх у патоку больш за 80%. На долю бягучай бібліяграфічнай прадукцыі прыпадае каля 20%. Ужо шмат гадоў РНМБ выдае бягучы бібліяграфічны дапаможнік "Новые медицинские книги" (2135 (2001 г.), 2378 (2002 г.)), які не так даўно набыў новую назву "Новые медицинские издания" (2502 (2003 г.), 2889 (2004 г.), 2403 (2005 г., ч. 1)). Ён выдаецца 1 раз у 2 месяцы і ўключае новыя паступленні айчынных і замежных кніг, электронных дакументаў, дысертацый, якія абараняліся ў Беларусі, і іншых дакументаў. Па-ранейшаму кожны з уваходзячых дакументаў мае шыфр захоўвання. З'явіўся новы раздзел, які адлюстроўвае нарматыўна-прававыя акты, што пазітыўна адаб'ецца на пашырэнні кола карыстальнікаў, будзе спрыяць рэалізацыі задачы комплекснага інфармавання карыстальнікаў. Разам з тым, улічваючы разнастайнасць уключаных у паказальнік дакументаў, якія не заўсёды адносяцца да выданняў, неабходна пашырыць і назву гэтага паказальніка. У дапаўненне да бібліяграфічнай інфармацыі аб новых паступленнях, у тым ліку і аб нарматыўна-прававых актах, Беларускі цэнтр медыцынскіх тэхналогій, інфарматыкі, кіравання і эканомікі (БелЦМТ) аператыўна інфармуе спецыялістаў галіны аб нарматыўна-прававых актах у галіне аховы здароў'я з дапамогай выходзячага інфармацыйнага зборніка "Указатель нормативно-правовых актов Республики Беларусь в области здравоохранения" (2379 (2002 г.)). Кожны выпуск уключае пэўную колькасць дэкрэтаў, указаў, законаў, пастаноў, інструкцый, якія дзейнічаюць. Матэрыял размяшчаецца па відах нарматыўна-прававых актаў. У апошнія гады БелЦМТ стварыў і падтрымлівае адпаведную базу даных.

Найбольшую частку патока бібліяграфічнай прадукцыі па медыцыне ў апошняе пяцігоддзе складалі біябібліяграфічныя паказальнікі. Яны былі прысвечаны прафесару Т. В. Бірыч (2737 (2005 г., ч. 1)), акадэмікам В. І. Вацякову (2216 (2002 г.)),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Я. Пракапчуку (2689 (2005 г., ч. 1)), А. Н. Філіповічу (3204 (2003 г.)), арганізатару аховы здароў'я І. А. Інсараву (2996 (2004 г.)), а таксама выдатным спецыялістам А. П. Красільнікаву (2217 (2002 г.)), Э. У. Фельдман (2725а (2005 г., ч. 1)), А. С. Леанцюку (2390 (2002 г.)), П. Р. Рыціку (2896 (2002 г.)) і іншым. Від гэтых паказальнікаў сумненняў не выклікае. Але складальнікі вызначаюць яго па рознаму: ад бібліяграфічнага паказальніка навуковых прац вучонага да біябібліяграфіі, бібліяграфіі, бібліяграфічнага зборніка. Сутнасныя метадычныя адрозненні таксама вызначаюць іх спецыфіку. Класічная структура біябібліяграфічнага паказальніка патрабуе ўключэння наступных раздзелаў: прадмова, асноўныя даты жыцця і дзейнасці, спіс навуковых прац вучонага па гадах і відах апублікаваных работ, спіс дысертацый, якія абараняліся пад кіраўніцтвам вучонага, літаратура пра яго, імянны паказальнік сааўтараў. Такую структуру маюць большасць са складзеных у гэты час біябібліяграфічных паказальнікаў.

Разам з тым сустракаюцца сапраўды творчыя падыходы. Напрыклад: у паказальніку, які прысвечаны адлюстраванню навуковай дзейнасці і прац А. П. Красільнікава (2217 (2002 г.)), прадстаўлена некалькі раздзелаў, складзеных спецыялістамі-медыкамі, у якіх адлюстраваны ўклад вучонага ў даследаванне розных праблем (склеромнай інфекцыі, унутрыбальнічнай інфекцыі, імуналогіі хранічных інфекцый і інш.). У гэтых жа раздзелах адлюстраваны і дысертацыі, выкананыя пад кіраўніцтвам вучонага. У раздзеле, які ўяўляе нарыс навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці вучонага, шырока прадстаўлены фотаздымкі. Цікавым па методыцы з'яўляецца і біябібліяграфічны паказальнік, прысвечаны І. А. Інсараву (2996 (2004 г.)), які складаецца як з традыцыйных для гэтага віда бібліяграфічных паказальнікаў раздзелаў, так і з гістарычных і навуковых аглядаў: "Уклад І. А. Інсарава ў тэорыю і практыку аховы здароў'я ў Беларусі"; "Медыцынская навука Беларусі ў пасляваенныя гады". Асобным раздзелам паказана грамадская дзейнасць гэтага спецыяліста. Адметнасцю біябібліяграфічнага паказальніка, прысвечанага А. Я. Пракапчуку (2689 (2005 г., ч. 1)), з'яўляецца яго выданне на беларускай мове. Акрамя традыцыйных відаў апублікаваных навуковых работ у ім адлюстраваны таксама і навукова-папулярныя выданні, і газетныя артыкулы, што пацвярджае жаданне складальнікаў дасягнуць максімальнай паўнаты адбору дакументаў. Тут таксама ёсць спасылкі на імянны сайт вучонага. Яшчэ адной асаблівасцю біябібліяграфічных паказальнікаў за гэты перыяд з'яўляецца іх размяшчэнне ўнутры манаграфій самога аўтара, напрыклад: С. В. Федаровіча (3161, 3162, 3163 (2004 г.)). Сам паказальнік пры гэтым пабудаваны па класічнай методыцы.

Наступная вялікая група бібліяграфічных паказальнікаў адлюстроўвае навуковыя працы супрацоўнікаў кафедраў, інстытутаў, лабараторый і, часцей усяго, бывае прысвечана юбілеям арганізацый ці працягвае папярэднюю працу па адлюстраванні навуковай прадукцыі. За апошняе пяцігоддзе было створана два такіх паказальніка, прычым абодва былі прысвечаны юбілеям арганізацый. Так, бібліятэка БДМУ да 80-годдзя кафедры грамадскага здароў'я і аховы здароў'я падрыхтавала паказальнік прац супрацоўнікаў кафедры "Библиографический указатель опубликованных работ профессорско-преподавательского состава кафедры общественного здоровья и здравоохранения Белорусского государственного медицинского университета (1924–2004 гг.)" (1892 (2005 г., ч. 1)). Ён уключае больш за 1200 навуковых прац, размешчаных па гадах, што дае магчымасць прасачыць развіццё навуковага патэнцыялу калектыва кафедры за вялікі адрэзак часу. У паказальніку размешчаны таксама агляд дзейнасці кафедры. Цікавым з'яўляецца падыход да стварэння імяннога дапаможнага паказальніка, які, акрамя традыцыйных спасылак

на нумар апублікаванай работы, указвае на гады, на працягу якіх спецыяліст працаваў на кафедры. Да 45-годдзя аналагічнай кафедры Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі выйшла інфармацыйнае выданне "Актуальные проблемы общественного здоровья и здравоохранения : к 45-летию кафедры общественного здоровья и здравоохранения Белорусской медицинской академии последипломного образования : (история кафедры, персональный состав кафедры, библиографический указатель основных научных и учебно-методических работ сотрудников кафедры)" (1890 (2005 г., ч. 1)), якое складаецца з дзвюх частак. У першую ўключаны агляд дзейнасці кафедры і яе персанальны склад, прычым па кандыдатуры кожнага вучонага адзначаюцца яго пасада, сфера навуковых інтарэсаў, прафесійныя дасягненні, тэматыка навуковых даследаванняў і агульная колькасць апублікаваных работ. Другая частка выдання прадстаўляе бібліяграфічны паказальнік асноўных навуковых і навукова-метадычных прац супрацоўнікаў інстытута, які ўключае больш за 600 работ, размешчаных у тэматычных раздзелах. Складальнікі спецыяльна абумоўліваюць адступленне ад правілаў бібліяграфічнага апісання, якое звязана з неабходнасцю адлюстраваць удзел кожнага супрацоўніка ў падрыхтоўцы той ці іншай работы.

Колькасць тэматычных бібліяграфічных паказальнікаў у параўнанні з папярэднімі гадамі значна скарацілася. РНМБ складае такога кшталту бібліяграфічныя рэсурсы толькі да значных грамадскіх падзей, напрыклад: да сусветнага дня прафілактыкі СНІД (2725 (2005 г., ч. 1)), з'ездаў урачоў (2241 (2001 г.)) і інш. Як звычайна, яны маюць адзіныя метадычныя прыёмы складання: уключаюць дакументы за некалькі апошніх гадоў, адлюстроўваюць розныя віды дакументаў. Крыніцамі выяўлення дакументаў служаць электронны каталог і базы даных бібліятэкі. Важна, што дакументы, якія ёсць у фондзе бібліятэкі, дапаўняюцца шыфрамі захоўвання. Гэтая група бібліяграфічнай прадукцыі ўзбагацілася новым падыходам да стварэння і размяшчэння. Так, у падручніку А. А. Пашкова "Лекции по медицинской генетике" ў якасці дадатка быў надрукаваны "Спіс крыніц для пошуку інфармацыі па генетычным сіндромам" (3160 (2004 г.)). Ён уключае як традыцыйныя перыядычныя выданні, кнігі па тэме даследавання, так і электронныя адрасы інтэрнэт-рэсурсаў і базы даных. Такі падыход да рэкамендацыі бібліяграфічных крыніц студэнтам для самастойнага пошуку інфармацыі магчыма распаўсюдзіць і на іншыя вучэбныя выданні.

Неабходна адзначыць, што ў апошняе пяцігоддзе РНМБ пэўную ўвагу надае распаўсюджванню дасягненняў медыцынскай навукі, стварэнню інтэлектуальных кантактаў паміж спецыялістамі, абагульненню звестак аб выдатных дзеячах медыцынскай навукі і практыкі. Рэалізацыя гэтага накірунку дзейнасці адбываецца шляхам стварэння інфармацыйнай прадукцыі, якая ўключае разам з фактаграфічнымі звесткамі і інфармацыю аб дакументах. Напрыклад: інфармацыйны зборнік "Достижения медицинской науки Беларуси" (2384 (2002 г.)) з'яўляецца чарговым выпускам, які інфармуе аб выніках завершаных навукова-даследчых работ, выкананых ва ўстановах аховы здароў'я. Такая ж інфармацыя размяшчаецца і ў Інтэрнэце. Па кожнай распрацоўцы прыводзіцца шэраг тыповых рубрык, узятых з інфармацыйных картак пры рэгістрацыі завершаных НДР: тэматыка, аўтары распрацоўкі, тэрміны выканання даследавання, навуковы кіраўнік тэмы, крыніцы фінансавання, галіна выкарыстання вынікаў, рэкамендацыі па выкарыстанні дасягненняў, прапановы па супрацоўніцтву. Кожная завершаная распрацоўка суправаджаецца рэфератам, заіндэксавана па рубрыкатару ДРНТІ. Актыўную працу па стварэнні бібліяграфічных даведнікаў праводзіць Рэспубліканскі музей гісторыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

медыцыны і РНМБ. Яны падрыхтавалі выданне "Медицинские работники Беларуси, удостоенные почетных званий и наград 1919—2004 гг." (2496 (2005 г., ч. 1)), якое з'яўляецца працягам выдадзенага ў 1978 годзе бібліяграфічнага паказальніка. Дадзенае выданне папоўнілася новымі матэрыяламі. Матэрыял размешчаны па раздзелах у адпаведнасці з сістэмай ганаровых званняў. Асобна выдзелены раздзел, прысвечаны ўзнагародам замежных грамадзян. Аб кожнай асобе, уключанай у даведнік, прыводзяцца: прозвішча, займаемая пасада і крыніца інфармацыі аб прысуджэнні ганаровага звання. Сярод бібліяграфічных даведнікаў гэтага перыяду вызначаюцца таксама працы Рэспубліканскага музея гісторыі медыцыны: "Знамянальныя і юбілейныя даты гісторыі медыцыны Беларусі, 2003 год" (2888 (2004 г.)), "Ахова здароў'я і медыцынская навука Беларусі: знамянальныя і юбілейныя даты, 2004 год" (2995 (2004 г.)), "Ахова здароўя і медыцынская навука Беларусі: знамянальныя і юбілейныя даты, 2005 год" (2495 (2005 г., ч. 1)). У іх падрыхтоўцы прымала ўдзел беларуская асацыяцыя гігіеністаў і арганізатараў аховы здароўя. Паказальнікі ўключаюць больш за 300 артыкулаў, якія прысвячаюцца знамянальным і юбілейным датам. Па кожнаму аб'екту прыводзяцца кароткая даведка і спіс літаратуры.

За апошняе пяцігоддзе выйшаў таксама комплексны паказальнік прац РНМБ "Республиканская научная медицинская библиотека Беларуси : библиографический указатель, 1991–2000 гг." (2404 (2005 г., ч. 1)), які ўключае розныя жанры матэрыялаў, у тым ліку, бібліяграфічныя паказальнікі і спісы, апублікаваныя працы супрацоўнікаў бібліятэкі, метадычныя і афіцыйныя матэрыялы, артыкулы ў перыядычным друку, прысвечаныя бібліятэцы.

Як заўсёды, да буйных манаграфій складаюцца прыкніжныя спісы літаратуры, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай пошуку тэматычнай інфармацыі. У апошняе пяцігоддзе такія спісы складалі больш за 400 назваў выкарыстаных крыніц. Гэта, напрыклад: спісы да манаграфій Меркулавай Е. П. "Латентные тимпанальные заболевания у детей" (2638 (2005 г., ч. 1)) (419 назваў); Гунько И. И. "Комплексное лечение зубочелюстных аномалий сформированного прикуса" (3421 (2004 г.)) (492 назваў) і інш.

Такім чынам, развіццё бібліяграфічных паказальнікаў па медыцыне за 2001–2005 гады мае свае адметнасці: скарачэнне патоку традыцыйнай бібліяграфічнай прадукцыі па агульнай колькасці і відавой разнастайнасці; уключэнне бібліяграфічнай прадукцыі ў іншыя віды інфармацыйных выданняў (аналітычныя зборнікі, фактаграфічныя даведнікі); пашырэнне значэння прыкніжных спісаў літаратуры як крыніц пошуку неабходнай інфармацыі; пераход да стварэння бібліяграфічнай прадукцыі, звязанай з канкрэтнымі запытамі, ці прымеркаванай да пэўных падзей; значнае павялічэнне ў патоку біябібліяграфічных паказальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ